*У.К. КОРШУК*

# УПЛЫЎ ІДЭАЛОГІІ ЛІБЕРАЛІЗМУ НА БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА ПАЧАТКУ XX ст.

Показано влияние либерализма на белорусское общество в начале XX в. Рассматриваются его основные направления и особенности на территории Беларуси, а также вклад либералов в национальное государственное строительство.

The article shows the impact liberalism had on the Belarusian society in the early 20th century. The main trends of liberalism and its local peculiarities are discussed as well as the contribution of the Liberals into the shaping of the Belarusian statehood.

Ідэалогія лібералізму пачала фарміравацца на Захадзе ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. Нягледзячы на тое што ўкараненне ліберальнага светапогляду ў Расіі па шматлікіх прычынах адбылося значна пазней, чым у Еўропе і ЗША, прадстаўнікі расійскай, у тым ліку і беларускай, грамадскасці ўнеслі свой уклад у разуменне і распрацоўку лібералізму. Неабходна дадаць, што лібералы Беларусі ў пачатку XX ст. сталі фактычна адэптамі ўжо распрацаванай ідэалогіі і або ўваходзілі ў склад агульнарасійскіх ліберальных партый розных кірункаў, або састаўлялі ўласныя праграмы на аснове перапрацоўкі праграм названых партый. Такая з’ява была вынікам адсутнасці ў Беларусі земстваў – органаў мясцовага самакіравання, у якіх практычна ўзгадваўся рускі лібералізм.

Да азначанага часу размежаванне кірункаў у сусветным ліберальным лагеры адбілася на рэфарматарскай апазіцыі Расійскай імперыі такім чынам, што ў рамках дастаткова шырокай агульнатэарэтычнай ліберальнай мадэлі існаваў шэраг субмадэлей палітычнага пераўтварэння краіны, якія адрозніваліся маштабам, глыбінёй, тэмпамі прапанаваных пераўтварэнняў, рознымі формамі і метадамі барацьбы з аўтарытарным рэжымам.

У Беларусі, як і паўсюдна ў Расіі, з гэтага рада субмадэлей выдзеліліся ў пачатку XX ст. тры асноўныя плыні: кансерватыўны лібералізм, які прытрымліваўся ідэалогіі класічнага лібералізму; памяркоўны лібералізм, у якім назіраліся рысы ідэалогіі як класічнага, так і новага лібералізму з перавагай першага; ліберальны радыкалізм, што цалкам засноўваўся на грунце новага лібералізму.

Але нельга лічыць, што размежаванне кірункаў у ліберальным лагеры Беларусі цалкам капіравала расійскае. Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця надалі мясцовым ліберальным мадэлям свае характэрныя рысы, найважнейшымі з якіх па шэрагу прычын можна лічыць незавершанасць дыферэнцыяцыі беларускай нацыі, нявырашанасць нацыянальнага пытання і адсутнасць уласнай дзяржаўнасці. У Беларусі межы паміж гэтымі кірункамі часта выглядалі размытымі.

Праграмы грамадска-палітычных утварэнняў з ліберальнай арыентацыяй нярэдка спалучалі ў сабе розныя па ступені радыкальнасці патрабаванні ў вырашэнні асобных сацыяльных пытанняў. Прыметнай асаблівасцю ліберальнага лагера Беларусі была надзвычайная актыўнасць і ўплывовасць клерыкальных колаў, асабліва каталіцкіх, якія заснавалі тут у пачатку XX ст. шэраг грамадска-касцёльных арганізацый з ліберальнай афарбоўкай. Апошнія прапаноўвалі своеасаблівыя ліберальныя праграмы пераўтварэння існуючага ладу, што павінны былі ажыццяўляцца пад наглядам касцёла. Не менш актыўнымі прадстаўнікамі лібералаў у Беларусі былі шырокія яўрэйскія і польскія або паланізаваныя землеўладальнікі, што таксама з’яўлялася адметнай рысай у характарыстыцы ліберальнага лагера краю. Аднак калі яўрэйскія арганізацыі спавядалі ліберальны радыкалізм, то магнацтва Беларусі стаяла на грунце кансерватыўнага лібералізму.

Увогуле, кансерватыўны лібералізм у Беларусі, як і ва ўсёй Расійскай імперыі, у той час быў прадстаўлены часткай насельніцтва, што была цесна звязана з зямлёй і памешчыкамі: большасцю рускіх і польскіх дваран-землеўладальнікаў, часткай чыноўнікаў рускага паходжання, праваслаўным духавенствам. Як адзначалася, ідэалогія дадзенага кірунку базіравалася на фундаменце класічнага лібералізму. Яе пераемнасць выяўлялася ў агульных для ўсіх лібералаў-кансерватараў імперыі прынцыпах недатыкальнасці прыватнай уласнасці, дэцэнтралізацыі дзяржаўнага кіравання і развіцця самакіравання, адмены саслоўных прывілеяў і ўраўноўвання ў правах усіх грамадзян. З дапамогай пералічаных пераўтварэнняў ліберальныя кансерватары як у Беларусі, так і ва ўнутраных губернях імперыі імкнуліся дамагчыся ўдзелу ў дзяржаўным кіраванні праз ліквідацыю бюракратычнага нараста з дапамогай рэформы «зверху» і замене яго эфектыўнай сістэмай самакіравання з шырокімі паўнамоцтвамі.

Але гэтыя прынцыпы мелі неаднолькавую ступень глыбіні ў палітыка-ідэалагічных распрацоўках розных груповак ліберальных кансерватараў краіны.

Так, у Беларусі фактычна існавалі дзве разнавіднасці кансерватыўнага лібералізму, якія адрозніваліся і адна ад другой, і ад агульнаімперскай ідэалогіі: польскі памешчыцкі і рускі нацыяналістычны лібералізм. Раскол кансерватыўных лібералаў у Беларусі быў вынікам таго, што абедзве групоўкі разлічвалі ў першую чаргу з дапамогай земстваў забяспечыць палітычнае панаванне сваёй нацыянальнасці ў краі.

Так, напрыклад, прадстаўнікі рускіх кансерватыўных лібералаў у Беларусі ў 1909 г. сцвярджалі: «Урад павінен пабудаваць сістэму земскіх выбараў на больш шырокіх пачатках, з прыцягненнем рускага элемента. Няхай яны будуць рускімі»[1]. Усе іх далейшыя ідэалагічныя ўстаноўкі зыходзілі з дадзенай канкрэтнай мэты. Ліберальныя кансерватары рускага паходжання ў Беларусі, аб’яднаўшыся ў «Паўночна-Заходняе рускае веча», «Рускі ўскраінны саюз», камітэты «Саюза 17 кастрычніка» і інш., адрозніваліся тым, што часта самі належалі да бюракратычных колаў. Да іх таксама далучаліся і псеўдабеларускія арганізацыі, якія атрымлівалі субсідыі ад урадава-бюракратычнага апарату, як, напрыклад, таварыства «Селянін». Таму, узяўшы за аснову праграму акцябрыстаў, яны вымушаны былі лічыцца з «планамі і намерамі ўрада»[2] і ўслед за ўрадам паступова схіляліся ўправа. Многія з іх зліліся ідэаламі з чарнасоценнымі камітэтамі «Саюза рускага народа». Напрыклад, калі ЦК партыі акцябрыстаў ставіўся ў апазіцыю ўраду, беларускія правінцыяльныя камітэты гэтай партыі амаль заўсёды аказваліся правей урадавай палітыкі.

Аднак, прадстаўляючы сабой насаджаную меншасць у краі, не забяспечаную значным эканамічным уплывам, рускія лібералы-кансерватары Беларусі намагаліся перацягнуць на свой бок беларускае працоўнае насельніцтва. Таму ў іх праграмах прызнавалася права на самастойнае культурнае развіццё «кожнай народнасці», прапаноўвалася адкрыццё «ніжэйшых школ з выкладаннем на беларускай мове», выданне «танных народных газет на мясцовым дыялекце» і г. д.[3] З той жа мэтай мясцовыя рускія кансерватыўныя лібералы выказваліся часам за неабходнасць частковай экспрапрыяцыі памешчыцкіх зямель для вырашэння аграрнага пытання, тады як сталічныя акцябрысты ўключылі права ўласнасці ў спіс асноўных праў і дапускалі экспрапрыяцыю часткі памешчыцкіх уладанняў толькі ў якасці апошняга сродку.

Аграрнае пытанне было прынцыпова важным для кансерватыўных лібералаў-палякаў у Беларусі. З’яўляючыся ў асноўнай сваёй масе буйнымі памешчыкамі-латыфундыстамі, яны імкнуліся захаваць і замацаваць сваё эканамічнае панаванне ў краі і таму цвёрда адстойвалі прынцып недатыкальнасці прыватнай уласнасці, у тым ліку і на зямлю. Іх аграрная праграма нагадвала праект зямельнай рэформы П.А. Сталыпіна і базіравалася на доказах аб неабходнасці ўзняцця культуры дробнага землекарыстання. Меркаванні гэтай групоўкі найбольш выразна адлюстраваны ў словах Э.А. Вайніловіча, члена Дзяржаўнага савета ад Мінскай губерні, якія былі выказаны ім на Варшаўскім з’ездзе памешчыкаў-палякаў у лістападзе 1906 г.: «...аграрнае пытанне ў Літве патрабуе іншага вырашэння, чым у Польшчы, – сцвярджаў Вайніловіч, – дзе таксама неабходна дадатковае надзяленне, але спярша трэба ўзняць у асяроддзі яго культуру, каб ён змог уласнай працай і на ўласныя грошы набыць зямлю»[4].

Дадатковае ж надзяленне зямлёй сялян Беларусі павінна было, паводле аграрнай праграмы польскіх ліберальных кансерватараў, ажыццяў-

ляцца праз куплю зямель сялянскімі банкамі і продаж яе мала- і беззямельным сялянам з працяглай растэрміноўкай працэнтаў, залог дробных дзялянак пад ссуду і рассяленне на хутары. Такое стаўленне да амаль што галоўнага для Беларусі сацыяльнага пытання дазволіла магнатам-лібералам, арганізаваным у «Польска-літоўска-беларускую групу» ў Дзяржаўнай Думе і «Краёвую партыю Літвы і Беларусі», поўнасцю падтрымаць Сталыпінскую аграрную рэформу. Нязначную трансфармацыю зведала іх аграрная праграма і пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

Радыкалізацыя грамадства вымусіла землеўладальнікаў уключыць у праграму патрабаванні прымусовага адчужэння царкоўных, манастырскіх, царскіх і нават у пэўных выпадках прыватнаўласніцкіх зямель па «добрасумленнай ацэнцы»[5] для павелічэння надзелаў малазямельных сялян.

У астатніх пытаннях яны схіляліся ў бок памяркоўнага лібералізму: больш паслядоўна дамагаліся раўнапраўя ўсіх грамадзян, паколькі для іх існавалі пэўныя абмежаванні, уведзеныя расійскім урадам, «пашырэння канстытуцыйных праў, гарантуючых усялякія свабоды насельніцтву»[6], дэцэнтралізацыі ўрадавых і грамадскіх устаноў і шырокага мясцовага самакіравання, свабоды сумлення і аддзялення царквы ад дзяржавы. Апошняе з названых патрабаванняў па сутнасці было пратэстам супраць насаджэння праваслаўя і ганення каталіцкай царквы ў Беларусі. Дадзеная пазіцыя сутыкала гэту групоўку з прыхільнікамі памяркоўнага лібералізму і адначасова выклікала мноства супярэчнасцей у адносінах з рускімі кансерватыўнымі лібераламі Беларусі.

Памяркоўны лібералізм вылучыўся як самастойная плынь у ходзе працы I Дзяржаўнай Думы і атрымаў назву «прагрэсізм». У аснове ідэалогіі дадзенага кірунку ляжалі два прынцыпы: барацьба супраць усялякага парушэння канстытуцыі і пабудова ў першую чаргу на этычных пачатках усіх вызваленчых тэндэнцый. Адметнымі рысамі дадзенага кірунку былі паслядоўнае выступленне за абмежаванне праў цара заканадаўчым народным прадстаўніцтвам, якое б выбіралася на аснове ўсеагульнага выбарчага права; адстойванне ідэі юрыдычнай згоды манарха і грамадства. Памяркоўныя лібералы дапускалі магчымасць выдання дадзенай манархам канстытуцыі або прыняцця канстытуцыі, выпрацаванай Устаноўчым сходам. Такім чынам, памяркоўныя лібералы Расійскай імперыі сталі прытрымлівацца поглядаў прадстаўнікоў «чыстага лібералізму» і з гэтага становішча крытыкавалі ўсіх астатніх.

З агульнарасійскіх памяркоўна-ліберальных партый на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі партыя мірнага абнаўлення, партыя дэмакратычных рэформаў, прагрэсіўная руская партыя. З краёвых палітычных утварэнняў на гэтай платформе знаходзіліся: Канстытуцыйна-каталіцкая партыя, партыя «Паўночна-Заходняя ўскраіна», «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» і інш.

Характэрным для партый ліберальнага «цэнтра» было ўсведамленне неабходнасці буйной сацыяльнай рэформы ў зямельнай гаспадарцы. Менавіта з аграрнай рэформай, пабудаванай на ідэале прымусовага адчужэння часткі прыватнаўласніцкіх зямель, яны звязалі далейшы прагрэс у Расіі, разлічвалі прыцягнуць на свой бок беспартыйных сялян і вывесці іх з-пад уплыву левых партый. Экспрапрыяцыя зямель, па разліках памяркоўных лібералаў, павінна была ажыццяўляцца ў выглядзе іх выкупу ў памешчыкаў за кошт дзяржавы. Надзяленне сялян зямлёй прапаноўвалася ажыццяўляць праз сялянскія банкі за ўстаноўленую законам плату. Акрамя таго, менавіта ў ідэалогіі памяркоўных лібералаў прысутнічала імкненне вырашыць зямельнае пытанне з улікам канкрэтных мясцовых умоў з прыцягненнем усіх зацікаўленых бакоў – сялян, памешчыкаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

Частцы польскага насельніцтва краю імпанавалі і праграмныя распрацоўкі памяркоўных расійскіх ліберальных партый па нацыянальнаму пытанню. Р.А. Скірмунт, вядомы беларускі палітычны дзеяч, на з'ездзе землеўладальнікаў Мінскай губерні ў ліпені 1906 г., агітуючы за партыю мірнага абнаўлення, сцвярджаў: «...там мы бачылі патрыятызм, які дае правы і іншым для культурнага развіцця»[7]. Сапраўды, памяркоўныя ліберальныя партыі не толькі прызнавалі правы на культурна-нацыянальную аўтаномію для нярускіх народнасцей імперыі, але і дапускалі аўтаномнае кіраванне асобнымі тэрыторыямі. Такім чынам, яны імкнуліся звязаць у адзінае палітычныя і сацыяльныя рэформы.

І ўрэшце, радыкальны лібералізм у Беларусі атрымаў даволі шырокае распаўсюджанне з прычыны нявырашанасці нацыянальнага пытання: шырокія колы яўрэйскага, частка польскага і ўласна беларускага грамадства ўспрынялі ідэалогію агульнарасійскіх партый ліберальна-радыкальнага кірунку, у першую чаргу Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі «Народная воля», і пачалі складаць уласныя праграмы на аснове ўстановак партыі[8].

Ідэалогія дадзенага кірунку лібералізму была пабудавана на базе сацыяльнага рэфармізму. У адрозненне ад кансерватыўных і памяркоўных лібералаў рэфарматары-радыкалы ўжо нічога не чакалі ад самаўладдзя, з якім былі першапачаткова ў стане адкрытай варожасці, і бачылі ў рэвалюцыі спосаб усталяваць у краіне «свабоду і правы». Таму на стадыі станаўлення ў сваіх ідэалагічных распрацоўках ішлі на ўступкі сацыял-радыкалам, каб усе ворагі самаўладдзя змаглі стаяць на адным агульным фронце.

Палітычныя патрабаванні кадэтаў у Беларусі ў 1906 г. зводзіліся да наступных прынцыповых пазіцый: забеспячэнне праў чалавека і грамадзяні-

на, гарантаваных устанаўленнем прадстаўнічага спосабу праўлення, агульным выбарчым правам, роўным для ўсіх; забеспячэнне права на культурнае самавызначэнне; у эканамічнай палітыцы – перакладання падаткаў на плечы маёмаснага класа, вырашэння рабочага і аграрнага пытанняў шляхам устанаўлення васьмігадзіннага працоўнага дня, дзяржаўнага страхавання рабочых, неадкладнага павелічэння землекарыстання сельскага працоўнага насельніцтва за кошт прымусовага адчужэння часткі прыватнаўласніцкіх зямель[9].

Да лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. кадэтаў падтрымлівалі шырокія колы яўрэйскага насельніцтва, аб'яднаныя ў сіянісцкія арганізацыі. Прытрымліваючыся ў агульным ідэалогіі партыі «Народная воля», яны лічылі яе адзінай выразніцай сваіх інтарэсаў, бо яна, на іх думку, «без агаворкі выказалася за раўнапраўе яўрэяў»[10], яўрэі-лібералы патрабавалі «дэмакратызацыі дзяржаўнага ўпарадкавання на пачатках строгага парламентарызму, шырокай палітычнай свабоды, аўтаноміі нацыянальных абласцей і гарантыі праў нацыянальных меншасцей»[11].

Ідэалагічныя распрацоўкі шматлікіх уласна беларускіх прыхільнікаў гэтага кірунку, узнікшых пасля звяржэння самаўладдзя, таксама дыхалі ўпэўненасцю ў неабходнасці радыкальнага рэфармавання грамадска-палітычнага ладу ў краіне. Хаця гэтыя арганізацыі прытрымліваліся прынцыповых палажэнняў праграмы кадэтаў, моцная канкурэнцыя з боку сацыял-дэмакратычных арганізацый вымушала іх ісці ў сваіх патрабаваннях у некаторых выпадках далей кадэтаў. Асабліва гэта было прыкметна на прыкладах іх прапаноў вырашэння аграрнага і нацыянальнага пытанняў.

Такія арганізацыі, як Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі, Віцебскі беларускі народны саюз, Аршанскі беларускі народны камітэт, Беларуская партыя народных сацыялістаў і інш., выступалі за стварэнне нацыянальнага зямельнага фонду з зямель манастырскіх, казённых, кабінецкіх, дзяржаўных, удзельных і прыватных. Спосаб уключэння прыватных зямель у праграмах розных партый выглядаў па-рознаму: ад адчужэння толькі часткі памешчыцкіх зямель за кошт Нацыянальнага фонду да поўнага іх адчужэння без усялякага выкупу. Але ўсе гэтыя арганізацыі выступалі менавіта за канстытуцыйнае вырашэнне аграрнага пытання ў рамках Устаноўчага сходу. Так, напрыклад, Віцебскі беларускі народны саюз агаворваўся: «... падставы, на якіх прыватнаўладальніцкія землі будуць перададзены ў фонд, павінны быць устаноўлены Устаноўчым сходам, які з'яўляецца адзінаправамоцным на такое адчужэнне і ў гэтых адносінах, не парушаючы нічыіх інтарэсаў, несумненна, выпрацуе самы справядлівы спосаб пераходу патрэбнай народу зямлі»[12]. Што тычыцца нацыянальнага пытання, то розныя беларускія грамадска-палітычныя ўтварэнні дадзенага тыпу настойвалі ў асноўным на тым, каб Беларусі было дадзена права на тэрытарыяльную аўтаномію ад адміністрацыйна-гаспадарчай да нацыянальна-дзяржаўнай у складзе Расійскай Федэрацыі з Краёвым сеймам у якасці заканадаўчага органа для вырашэння мясцовых пытанняў.

Такім чынам, у Беларусі ў пачатку XX ст. фактычна сфарміраваўся ліберальны блок. І хаця працэс кансалідацыі ліберальнага лагера ў краі застаўся незавершаным з нагоды цэлага шэрага прычын, ён не толькі стаў выразнікам грамадска-эканамічных інтарэсаў пэўных слаёў насельніцтва краю, але ўнёс свой уклад у беларускае нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва.

[1] Белорусская жизнь. 1909. 9 февр.
[2] Голос провинции. 1906. 15 сент.
[3] Гл.: Белая Русь. 1906. 2 марта.
[4] Голос провинции. 1906. 26 нояб.
[5] Гл.: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Ф. 325. Воп. 1. Спр. 195. Л. 110.
[6] Голос провинции. 1906. 19 июля.
[7] Голос провинции. 1906. 1 авг.
[8] Гл.: Российский государственный исторический архив. Ф. 1276. Оп. 2. Д. 8. Л. 54, 154, 304.
[9] Гл.: Могилевский голос. 1906. 6 янв.
[10] Голос провинции. 1906. 5 апр.
[11] Голос провинции. 1906. 3 дек.
[12] НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 81. Л. 12.

Паступіў у рэдакцыю 21.04.09.

***Уладзімір Канстанцінавіч Коршук*** – доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.